Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!



# Работніца і калгасніца Беларусі

№ 16

ОБЯЗАТЕЛЬНЫЙ КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

БССР

# МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ

Кожны год моладзь усяго свету святкуе Міжнародны Комуністычны Юнацкі Дзень.

Багатая гісторыя гэтага свята. Правадыры народаў таварышы Ленін і Сталін вялікае значэнне прыдавалі рэволюцыйнаму руху моладзі. Яны штодзённа выхоўвалі і накіроўвалі працоўную моладзь па правільнаму бальшэвіцкаму шляху.

У годы грамадзянскай вайны (1915 г.) па ініцыятыве Владзіміра Ільіча Леніна ў Берне (Швейцарыя) была склікана канферэнцыя соцыялістычных арганізацый моладзі, якая прыняла рашэнне аб правядзенні Міжнароднага Юнацкага Дня.

Першы раз гэтае свята было адзначана ў кастрычніку 1915 года. У Расіі ўпершыню моладзь святкавала Міжнародны Юнацкі Дзень у 1917 годзе—за тры тыдні да Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі.

У 1919 годзе пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна быў створан Комуністычны інтэрнацыянал моладзі—штаб рэволюцыйнай моладзі. З таго часу працоўная моладзь пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна праводзіць сваё традыцыйнае свята—Міжнародны Юнацкі Дзень у першых лічбах верасня месяца.

Совецкая моладзь, адзначаючы сваё свята, яшчэ раз прадэманструе перад усім светам сваю непакалебімую згуртаванасць вакол комуністычнай партыі, сваю бязмежную любоў да правадыра народаў, бацькі і друга—тав. Сталіна, сваю адданасць радзіме-маці.

Словы юнак, дзяўчына ганарова гучаць у нашай краіне! Моладзь наша мае вялікія творчыя сілы і баявы задор. Партыя бальшэвікоў, радзіма-маці клапатліва пестуюць сваіх сыноў і дачок,—для іх адкрыты шырокія дарогі да навукі, працы і адпачынку. Наша моладзь радасна і свабодна выкарыстоўвае ўсе правы, прадастаўленыя ёй.

Мільёны маладых хлопцаў і дзяўчат навучаюцца ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Вялікія сродкі выдаткоўвае ўрад на асвету нашых дзяцей.

Жыццерадасная і ўпэўненая ў будучае—такая наша моладзь. Яна не ведае беспрацоўя, яна ўпэўнена ў заўтрашнім дні.

Недарма моладзь пяе ў сваіх песнях:

> Сегодня весело живется,
> А завтра будет веселей...

Совецкая моладзь займае віднае месца ў кіраўніцтве нашай краінай. Аб гэтым гавораць лічбы выбараў у Вярхоўны Совет СССР. З ліку 1143 дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР—284 чал. ва ўзросце ад 18 да 30 год. Толькі па адной Беларусі абраны дэпутатамі Вярхоўнага Совета БССР 42 чалавекі ва ўзросце ад 18 да 25 год.

Многа фактаў можна прывесці з жыцця нашай моладзі, якія паказваюць, што з моладзі выхоўваюцца стойкія і самаадданыя патрыёты сваёй радзімы. Яркім сведчаннем з'яўляюцца падзеі ля возера Хасан. Маладыя байцы доблеснай Чырвонай Арміі паказалі цуды пры разгроме і знішчэнні зарваўшыхся японскіх захопнікаў.

Палкім пачуццём совецкага патрыётызма прасякнут кожны малады чалавек і дзяўчына нашай краіны. Дзе-б яны ні былі—ці на ганаровай вахце совецкага рубяжа, ці працуючы на заводзе і фабрыцы, ці змагаючыся за высокі сталінскі ўраджай на калгасных палях, усюды юнакі і дзяўчаты натхнёны сталінскімі клопатамі аб іх. У любую мінуту, па закліку партыі і ўрада, яны гатовы выступіць на абарону нашай краіны.

Шчаслівая моладзь квітнеючай краіны соцыялізма ніколі не забывае свае інтэрнацыянальныя абавязкі перад працоўнай моладдзю капіталістычных краін. Яна добра сабе ўяўляе, што так, як яркі сонечны дзень адрозніваецца ад цёмнай непраглядная ночы, так жыццё нашай моладзі адрозніваецца ад жыцця моладзі капіталістычных краін.

Фашысцкія варвары ўсімі сродкамі і мерамі калечаць моладзь. Юнакі і дзяўчаты працуюць па 12—14 гадзін на непасільных работах. Сотні тысяч маладых людзей загнаны ў казармы і турмы і там гінуць.

У фашысцкай Італіі батракоў прымушаюць працаваць ад зоркі і да зоркі. Нішчанскі заработак і беспрацоўе бацькоў пазбаўляюць дзяцей магчымасці вучыцца ў школах. 1 300 тысяч непісьменных сярод моладзі налічваецца ў Італіі.

Не лепш становішча і ў фашысцкай Японіі. Эксплаатацыя моладзі даходзіць у іх да такой ступені, што нават фашысцкі друк не можа аб гэтым маўчаць. Прафесар Хадэ Сейкай піша ў японскай газеце наступнае:

«Я абследаваў становішча маладых дзяўчат, занятых на японскіх фабрыках. Сярод 1.783.864 работніц налічваецца 940.965 падлеткаў, не дасягнуўшых 16-гадовага ўзросту. У рэзультаце нішчанскіх умоў жыцця і цяжкай працы падлеткі, не паспеўшыя яшчэ ўмацавацца, вырастаюць калекамі, сярод іх многа туберкулёзных».

Але працоўная моладзь капіталістычных краін, не гледзячы на катаванні і пагрозы, уздымае голас пратэсту супроць варвараў і прыгнятальнікаў-капіталістаў.

Кітайская моладзь, разам з усім народам Кітая, на працягу раду год вядзе герaічную барацьбу за сваё вызваленне.

У свята Міжнароднага Юнацкага Дня совецкая моладзь разам з працоўнай моладдзю ўсяго свету шле сваё палкае прывітанне кітайскаму народу і жадае яму і ў далейшым поспехаў у перамозе над японскімі захопнікамі.

Совецкая моладзь яшчэ больш будзе ўмацоўваць баявую гатоўнасць для абароны сваёй радзімы, будзе выконваць свае інтэрнацыянальныя абавязкі, ні на мінуту не забываючы ўказанняў вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна:

«Трэба ўмацоўваць інтэрнацыянальныя пролетарскія сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам буржуазных краін; трэба арганізаваць палітычную дапамогу рабочага класа буржуазных краін рабочаму класу нашай краіны на выпадак ваеннага нападу на нашу краіну, роўна, як арганізаваць усялякую дапамогу рабочага класа нашай краіны рабочаму класу буржуазных краін...»

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ № 16 ЖНІВЕНЬ 1939 г.

На вокладцы: Першакласнікі 4 сярэдняй школы гор. Мінска ідуць першы дзень на заняткі ў школу. (Фото Казловіча).

Ин. 1963 г. 64663

# Разгорнем большэвіцкую падрыхтоўку да выбараў

Наша рэспубліка пачала рыхтавацца да найвялікшай падзеі—выбараў у мясцовыя Советы працоўных. На адбыўшайся другой сесіі Вярхоўнага Совета БССР зацверджана «Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя советы дэпутатаў працоўных БССР». Гэтае палажэнне цалкам адпавядае Сталінскай Канстытуцыі. У ім пацвярджаецца незыблемае права кожнага грамадзяніна БССР, дасягнуўшага 18 год, выбіраць і быць выбраным у Советы дэпутатаў працоўных, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, вераспавядання, адукацыі, маёмаснага становішча, соцыяльнага паходжання і ранейшай дзейнасці.

Прадстаячыя выбары выклікаюць небывалую актыўнасць усяго насельніцтва, яны яшчэ і яшчэ раз прадэманструюць найвялікшую сілу Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, адзінства і згуртаванасць усяго нашага народа.

Выбары ў сельскія, раённыя, гарадскія і абласныя Советы дэпутатаў працоўных адбудуцца адначасова на працягу аднаго дня. Велізарная колькасць людзей будзе занята на падрыхтоўцы да іх. Па нашай рэспубліцы толькі ў выбарчых участках будуць работаць 200 тысяч чалавек. Яшчэ большая колькасць людзей будзе работаць агітатарамі.

Калі адбываліся выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР найвялікшую актыўнасць, разам з усім совецкім народам, праявілі жанчыны. Жанчыны нашай краіны—гэта поўнапраўныя грамадзяне, якія карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі ў органы дзяржаўнага кіравання. Якое гэта шчасце! І гэтым шчасцем карыстаюцца толькі жанчыны Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Лепшыя розумы чалавецтва вялі барацьбу за жаночае роўнапраўе, але толькі Кастрычніцкая рэволюцыя, толькі партыя Леніна—Сталіна прынеслі нам гэтыя правы, якія залатымі літарамі запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі.

Найвялікшы геній чалавецтва Владзімір Ільіч Ленін пісаў: «У буржуазнай рэспубліцы (г. зн. дзе ёсць прыватная ўласнасць на зямлю, фабрыкі, заводы, акцыі і інш.), хоць бы гэта была самая дэмакратычная рэспубліка, становішча жанчыны *нідзе ў свеце, ні ў адной самай перадавой краіне* не стала цалкам роўнапраўным».

Колькі-б ні пісалі буржуазныя пісакі аб усеагульным роўнапраўі, яго ў краінах капітала і ў паміне няма. Нават, у Францыі, у так званай дэмакратычнай краіне, жанчыны пазбаўлены выбарчых правоў.

Совецкая жанчына ўжо не раз паказала сваю адданасць партыі Леніна—Сталіна. Асабліва гэта было бачна ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўныя Советы саюзных і аўтаномных рэспублік, калі жанчыны разам з усімі выбаршчыкамі аддалі свае галасы кандыдатам у дэпутаты Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У часе надыходзячых выбараў у мясцовыя Советы нашы жанчыны таксама дакажуць як вялікая іх любоў да радзімы, да партыі, да вялікага Сталіна.

Велізарная работа прадстаіць па падрыхтоўцы да выбараў. Зараз неабходна пачаць сярод насельніцтва шырокае вывучэнне выбарчага закона. Ніводнай жанчыны не павінна быць, якая-б не ведала дасканала аб парадку прадстаячых выбараў, аб нашай выбарчай сістэме.

У часе мінулых выбараў многія жанчыны былі агітатарамі, работалі членамі выбарчых участкаў. Аграмадная колькасць з іх упершыню ў той час пазналі радасць, якую прыносіць грамадская работа. Якімі выдатнымі праваднікамі большэвіцкіх ідэй аказаліся многія работніцы, калгасніцы, інтэлігенты. Актывісткамі сталі і многія хатнія гаспадыні. Проста і зразумела растлумачвалі яны выбаршчыкам выбарчы закон, Канстытуцыю, агітавалі за кандыдатаў Сталінскага блока.

Многія з агітатараў не спынілі агітацыйнай работы і пасля выбараў. Яны часта бываюць на былых выбарчых участках, праводзяць гутаркі з насельніцтвам. Так, работніца-выдучэнка трубаліцейнага завода т. Лысенкова з'яўляецца адным з лепшых агітатараў сярод хатніх гаспадынь у гор. Магілёве. Цікава і змястоўна праводзіць яна гутаркі. Стараецца, каб слухачы ведалі, што адбываецца ў нашай краіне. Часта знаёміць сваіх гурткоўцаў т. Лысенкова і з міжнародным становішчам.

Многія агітатары добра паступаюць, калі арганізоўваюць з хатнімі гаспадынямі экскурсіі ў музеі, паходы ў кіно. Гэта таксама прыносіць жанчынам шмат карысці.

У сваім дакладзе на сесіі Вярхоўнага Совета аб прадстаячых выбарах старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР т. Наталевіч адзначыў, што ў часе мінулых выбараў мясцовыя арганізацыі недастаткова прыцягвалі жанчын да актыўнай работы па выбарах. Гэта неабходна ўлічыць зараз. Партыйныя, профсаюзныя і совецкія арганізацыі павінны вылучыць лепшых актывістак для агітацыйнай работы, для работы ў выбарчых камісіях і аказваць ім штодзённую дапамогу.

Няма сумнення, што кандыдатамі ў дэпутаты ў мясцовыя Советы працоўных БССР будуць выстаўлены лепшыя сыны і дочкі нашага народа, тыя, якія на справе даказалі адданасць радзіме і здольнасць змагацца з ворагамі.

Аднак трэба памятаць словы тав. Сталіна: «Калі народ дзе-ні-дзе і выбярэ варожых людзей, дык гэта будзе значыць, што наша агітацыйная работа пастаўлена з рук вон дрэнна, і мы ўпаўне заслужылі такую ганьбу. Калі-ж наша агітацыйная работа будзе ісці па-большэвіцку, то народ не прапусціць варожых людзей у свае вярхоўныя органы».

З аграмаднымі поспехамі падыходзіць да прадстаячых выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных наша краіна, адзіная ў свеце краіна соцыялізма, якая не ведае галечы і беспрацоўя, эксплаатацыі чалавека чалавекам. І ў часе прадстаячых выбараў совецкі народ яшчэ раз пакажа сваю згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол вялікага Сталіна.



Інв. 1958 г. 64653
91
Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна




Нядаўна ў Мінскім Парку Культуры і Адпачынку адбыліся Усебеларускія спартыўныя спаборніцтвы калгаснікаў - фізкультурнікаў, прысвечаныя Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы: На здымку: удзельніца велакроса на дыстанцыю 10 клм. калгасніца калгаса імя Леніна (Мінскага раёна) М. І. Данілевіч з сваім мужам А. Б. Данілевічам і дачкой Алачкай.

Фота Казловіча

# ПАЧЭСНАЯ РАБОТА

Агітатарам пачала я працаваць толькі ў гэтым годзе. Мне даручылі весці агітацыйную работу на былым выбарчым участку сярод хатніх гаспадынь двух дамоў па Связному першвулку. Заняткі праводжу 2—3 разы ў месяц.

Я правяла гутарку аб XIX гадавіне вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Зачытала жанчынам некалькі мастацкіх артыкулаў з успамінаў асобных партызан. Жанчыны зацікавіліся. Тут-жа, пасля гутаркі, слова ўзяла хатняя гаспадыня Рубінштэйн. Яна падзялілася сваімі ўспамінамі аб тых здзеках, якія ўтваралі белапольскія акупанты над працоўнымі Беларусі. Гутарка прайшла жыва і цікава.

Правяла я таксама гутаркі аб Ваенна-Марскім Чырвоным Флоце, аб антываенным дні. Падрабязна расказала пра міжнароднае становішча, аб ваенных правакацыях японскіх самураяў на граніцы Мангольскай Народнай Рэспублікі, аб падзеях, якія адбываюцца на захадзе. Жанчыны выказвалі сваё абурэнне па поваду японскіх правакацый і ўнеслі прапанову арганізаваць сярод хатніх гаспадынь гурток па вывучэнню абароннай справы. Правяла гутарку пра пазыку 3-й пяцігодкі, якую жанчыны сустрэлі з вялікім адабрэннем і ўсе, як адна, падпісаліся на пазыку.

Наступныя заняткі я правяла аб дні авіяцыі. Пазнаёміла хатніх гаспадынь з правіламі светамаскіроўкі па сігналу «паветраная трывога» і адразу прыступіла да вывучэння Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Заняткі я праводжу метадам жывой гутаркі. Чытаю кніжку або газету і падрабязна растлумачваю прачытанае. Змястоўна пабудаваная гутарка заўсёды выклікае ў слухачоў вялікую зацікаўленасць. Жанчыны часта выступаюць з сваімі заўвагамі і задаюць многа пытанняў.

Раней хатнія гаспадыні неахвотна наведвалі гурток. Некаторыя сумняваліся, што яны «старыя, куды ім ужо вучыцца». Але я пагутарыла з кожнай паасобку, правяла з імі гутарку, зацікавіла заняткамі і цяпер гурток рэгулярна наведвае 10—13 чалавек. Калектыўна хадзілі на выстаўку прамысловасці БССР.

Да заняткаў я ўважліва і старанна рыхтуюся, чытаю матэрыял па тэме, прадумваю яго, складаю канспект. Штодзённа сачу за газетамі, перачытваю ўсе артыкулы, якія друкуюцца ў дапамогу агітатарам. Сама вывучаю «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», чытаю мастацкую літаратуру, сістэматычна наведваю інструкцыйныя нарады, лекцыі і даклады, якія праводзіць райком партыі.

Даручаную мне вялікую пачэсную работу—несці ў масы словы бальшэвіцкай праўды—я выконваю з гонарам.

Мінск. **Зінаіда МАТЛОК.**

# АКТЫЎНАСЦЬ ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ

Я працую агітатарам на былым выбарчым участку з дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Гурток наведвае рэгулярна 25 хатніх гаспадынь. Заняткі мы распачалі з вывучэння матэрыялаў XVIII з'езда партыі. З выключнай увагай вывучалі даклад тав. Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП(б), які не адзін раз чыталі жанчыны, рыхтуючыся да заняткаў. Я іх добра пазнаёміла з дакладам тав. Молатава і перайшла к чыткам прамоў таварышоў Варашылава, Мехліса, Штэрна.

Хатнія гаспадыні добра ўсвоілі матэрыялы з'езда. Пасля вывучэння матэрыялаў XVIII з'езда я правяла гутаркі аб вызваленні Беларусі ад белапалякаў, аб дні Ваенна-Марскога Чырвонага Флота, аб сталінскім дні чыгуначніка. Правяла я таксама гутарку аб гадавіне падзей у раёне возера Хасан. Падрабязна расказала жанчынам аб герaізме чырвонаармейцаў, іх мужнасці ў часе абароны свяшчэнных граніц нашай радзімы.

Цяпер я прыступаю да вывучэння матэрыялаў 2-й Сесіі Вярхоўнага Совета БССР, да вывучэння Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Да заняткаў я заўсёды рыхтуюся добра, таму гутарка ў мяне атрымліваецца жывой і цікавай і ўсе жанчыны актыўна ўдзельнічаюць, задаюць пытанні і выступаюць самі.

Вялікую дапамогу ў маёй рабоце аказвае агіткалектыў. Я рэгулярна наведваю семінары па кожнай тэме, на іх я атрымліваю ўвесь неабходны матэрыял для правядзення гутарак, а таксама высвятляю незразумелыя пытанні.

Я пастараюся працаваць яшчэ лепш, каб апраўдаць тое давер'е, якое мне аказала наша партыйная арганізацыя.

**Агітатар ПРЫХАДОЎСКАЯ.**

г. Віцебск.



Адзін з лепшых агітатараў Мінскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча Р. І. Канцін праводзіць на былым ізбірацельным вучастку палітінфармацыю аб падзеях на Мангольска-Манчжурскай граніцы.

Фота І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА)

# МОЙ ВОПЫТ

Калі партыйная арганізацыя даручыла мне весці агітацыйную работу з хатнімі гаспадынямі па 3-й Кірпічнай вуліцы, я была вельмі задаволена і адразу-ж узялася за работу.

Праўда, агітатар я яшчэ малады. Працую толькі з мая месяца гэтага года. Аднак, за гэты не зусім вялікі час я правяла на сваім участку 10 заняткаў. Заняткі я праводжу строга па плану, які складаю на кожны месяц. За гэты час мы вывучылі даклады тав. Сталіна, тав. Молатава на XVIII з'ездзе нашай партыі. Нараду з вывучэннем матэрыялаў XVIII з'езда партыі я праводжу гутаркі аб міжнародным становішчы. Правяла таксама гутарку аб трохгоддзі з дня смерці вялікага рускага пісьменніка Алексея Максімавіча Горкага.

На апошніх занятках мы пазнаёміліся з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання». Нядаўна мы прыступілі да вывучэння Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Заняткі я праводжу метадам жывой гутаркі. Чытаю матэрыял, растлумачваю яго змест, пасля чаго жанчыны задаюць мне пытанні, а я адказваю на іх. Стараюся даваць зразумелыя і ясныя адказы.

Гурток наведвае 23—25 жанчын. Пасля заняткаў я арганізоўваю мастацкую самадзейнасць— песні, танцы, дэкламацыю.

Недахоп у нашым гуртку той, што яшчэ не ўсе жанчыны актыўна ўдзельнічаюць у занятках, мала задаюць пытанняў. Гэты недахоп я пастараюся ліквідаваць.

**Агітатар ЛЫСЕНКОВА.**

г. Магілёў.



Удзельніца соцспаборніцтва імя Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, машыністка-этыкіроўшчыца Барысаўскай запалкавай фабрыкі імя Кірава, комсамолка Л. П. Калячонак.

Фота Б. А. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).

# Вялікага гонару ўдастоіліся калгасніцы

Першага жніўня 1939 года быў падняты сцяг над Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкай. Наведвальнікі ўбачылі ва ўсёй велічы і архітэктурна-мастацкай прыгажосці грандыёзнае збудаванне, дастойнае вялікай сталінскай эпохі. Некалькі дзесяткаў павільёнаў-палацаў раскінуліся на вялікіх плошчах, ярка і ўпэўнена пацвярджаючы тарджаство ленінска-сталінскай палітыкі калектывізацыі. Выстаўка ва ўсёй паўнаце адлюстроўвае слаўны шлях перамог і дасягненняў, атрыманых калгасамі, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна.

«Гэта, перш за ўсё, выстаўка калгасаў, выстаўка калгасных перамог, у якіх мы бачым усёперамагаючую сілу саюза рабочых і сялян пад сцягам комунізма, пад сцягам вялікай партыі Леніна—Сталіна. У гэтым яе карэннае адрозненне ад сельскагаспадарчай выстаўкі 1923 года» (МОЛАТАЎ).

На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, якая арганізавана на аснове навукова-абгрунтаваных прынцыпаў адбору кандыдатаў, атрымалі права ўдзельнічаць 15 059 калгасаў, 11 004 калгасныя фермы, 268 МТС, 795 соўгасаў і 155 821 чалавек з перадавікоў і знатных людзей сельскай гаспадаркі. Выключна ганаровае месца на выстаўцы займаюць нашы калгасніцы, жанчыны трактарысткі, камбайнеркі, аграномы, ільнаводкі і інш. перадавікі сельскай гаспадаркі.

У ліку пяці тысяч удзельнікаў Усесаюзнай выстаўкі ад Беларускай ССР каля 40 проц. жанчын-калгасніц. У павільёне Беларускай ССР самыя відныя месцы на стэндах займаюць: Мішкова П. І. з калгаса імені Валадарскага, Магілёўскага раёна—ініцыятар звеннявой арганізацыі працы, Міцкевіч А. Г.—звеннявая калгаса «Заветы Ільіча», Шклоўскага раёна, ордэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, атрымаўшая ў 1938 г. па 9,54 *цнт* ільновалакна з гектара; Саранчук М. А.—звеннявая калгаса «ПОБЕДА», Рэчыцкага раёна, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, атрымаўшая з разрэджаных пасеваў ільна-даўгунца 13,95 *цнт* з га; Кондзерава А. І.—звеннявая калгаса «Юны комунар», Чавускага раёна, узнагароджаная ордэнам Леніна, атрымаўшая ў 1938 г. з га 10,84 *цнт* ільновалакна і 8, 62 *цнт* ільнонасення і інш.

У шасці залах павільёна маляўніча паказаны поспехі нашых слаўных калгасніц, якія не толькі не ўступаюць калгаснікам, а наадварот, займаюць перадавыя пазіцыі. Лепшая даярка фермы калгаса імені Куйбышэва, Бабруйскага раёна Чарнецкая Е. Г. ад кожнай з 9 абслугоўваемых ёю кароў у сярэднім за год на працягу 1937—38 гг. надаіла па 3 698 літраў малака.



Удзельніца выстаўкі знатны паляўнічы Ойроціі Тэенек Майнокава за мінулую зіму дабыла 170 белак, 10 гарнастаяў і 1 барса. Перад паездкай на выстаўку т. Майнокава забіла 7 ваўкоў.
На здымку: тав Тэенек Майнокава.
Фота І. Іоселевіча і Г. Шырокава
(Фотахроніка ТАСС)

Беларуская ССР у сузор'і 11 брацкіх совецкіх рэспублік, сагрэтая сонечнымі праменнямі вялікай Сталінскай Канстытуцыі, пад мудрым кіраўніцтвам роднага і вялікага Сталіна прышла на выстаўку з вялікімі перамогамі ў соцыялістычным будаўніцтве. Выключная дапамога і бацькоўскія клопаты, праяўляемыя аб беларускім народзе нашым бацькам і другам вялікім Сталіным і ўрадам Саюза ССР і асабіста главой урада тав. Молатавым, дапамога вялікага рускага народа сказалася на соцыялістычным ператварэнні рэспублікі.

Многа цікавага паказана на выстаўцы ў беларускім павільёне. Як знешнім выглядам, таксама і ўнутраным зместам наш павільён прыцягвае многа наведвальнікаў, не толькі беларусаў, але і узбекаў, украінцаў, велікарусаў, грузінаў, туркменаў, якія з вялікай павагай і любоўю знаёмяцца з дасягненнямі нашай рэспублікі.

**Дырэктар павільёна Беларускай ССР—ГЕРШМАН Г. М.**



На Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку прыязджаюць прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей Совецкага Саюза.
На здымку: дэлегацыя Грузінскай ССР на выстаўцы.
Фота Салавейчыка.

# УРАЖАННЕ, ЯКОЕ НЕ ЗГЛАДЗІЦЦА З ПАМЯЦІ

Выдатныя 5 дзён, якія мы правялі ў Маскве на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, наўрад ці калі-небудзь зглядзяцца з нашай памяці.

Мы ганарымся за нашу радзіму, за яе выдатныя кадры. Выстаўка з выключнай яркасцю адлюстроўвае магутнасць і сілу квітнеючай краіны соцыялізма, яна адлюстроўвае росквіт культуры і заможнасці нашых калгасаў і калгаснікаў.

Мы з вялікай увагай слухалі экскурсаводаў, якія падрабязна растлумачвалі нам аб усіх экспанентах і экспанатах. А як-жа не слухаць, калі перад тваімі вачыма цуды, зробленыя рукамі калгаснікаў і калгасніц?

З асобнай зацікаўленасцю мы праглядзелі на выстаўцы «Новае ў вёсцы». Мы бачылі культурна абсталяваныя будынкі. Бачылі сельсовет, праўленне калгаса, яслі, радзільны дом, школу, МТС, МТМ і інш. Вельмі хацелася-б, каб выключна ва ўсіх калгасах былі так абсталяваны гэтыя ўстановы.

З такой-жа зацікаўленасцю мы праглядзелі экспанаты жывёлагадоўлі. Гэта проста неапісуемае відовішча. Калі-б мы не бачылі гэта сваімі вачамі, то не паверылі-б, што могуць быць такія каровы, якія даюць каля 5 тыс. літраў малака ў год, вялікія быкі, вагой у 1 100 кгр. Мы бачылі авечак, свіней пародзістых і шмат іншага.

Мы сустрэліся і з экспанентамі, якія вырасцілі гэтыя цудоўныя экспанаты,—даяркай Рыльскай з Украіны і, многімі іншымі ордэнаносцамі—наватарамі соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Пасля агляду Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі для нас застаецца ясным адно, што на месцы ў сваіх калгасах мы не зрабілі ўсяго неабходнага, не гледзячы на тое, што ў нас ёсць усе магчымасці.

Выстаўка для нас з'явілася вялікай школай, мы многае пераняспем у свае калгасы. Раскажам на месцы калгаснікам, калгасніцам, што бачылі, і будзем дабівацца ўсімі сіламі, каб на будучы год на Ўсесаюзную Выстаўку прыйсці з удзесяцяронымі дасягненнямі.

**Группа экскурсантаў Халопеніцкага раёна:**
**Старавойтава Феціння, Жук Хоўра, Казак Ульяна, Макрыцкая Ніна.**



Беларуская калгасная самадзейнасць на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве.
На здымку: момант выступлення на Калгасным Пляцу.

Фота Салавейчыка.



Пляцоўка перад уваходам у павільён Узбекістана дэкарыравана чатырма пазалочанымі скульптурамі. Усярэдзіне пляцоўкі—лёгкая прыгожая альтанка ва ўсходнім стылі.

Фота Салавейчыка.

На здымку: Павільён Узбекістана. На пярэднім плане альтанка.

# Будем актыўнымі агітатарамі выстаўкі

Быць у роднай Маскве на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы—гэта вялікі гонар і шчасце. Колькі багацця, колькі радасці і прыгожасці ўбачылі мы на выстаўцы. Тут паказана наша неабдымная радзіма—ад халоднага паўночнага полюса, да квітнеючага Азербайджана, Таджыкістана і сонечнай Грузіі. Глядзіш і сэрца радуецца!

Перш за ўсё мы пабывалі ў павільёне сваёй ордэнаноснай рэспублікі. Выдатна, маляўніча аформлен беларускі павільён. Скульптура пагранічніка і калгасніцы, устаноўленая пры ўваходзе, гаворыць аб моцным і нерушымым фарпосце СССР на рубяжы з капіталістычным захадам, аб тым, што беларускі народ бязмежна любіць Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і нашых слаўных пагранічнікаў.

Прыгожыя архітэктурныя формы павільёна ў спалучэнні з мастацкім і скульптурным афармленнем адлюстроўваюць свабоднае і шчаслівае жыццё народаў Совецкай Беларусі. Багата наша рэспубліка і ўсё гэта паказана ў экспанатах павільёна. Кожны экспанат, кожны стэнд павільёна гавораць аб выдатнай стаханаўскай рабоце герояў і гераінь соцыялістычнай працы, майстраў высокіх ураджаяў і ўдояў.

Не менш прыгожа аформлены павільёны нашых брацкіх рэспублік, павільёны «Механізацыя», «Зярно», «Жывёлагадоўля». Гэта цэнтральныя павільёны, якія паказваюць тэхнічную аснашчонасць соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, абілле і высокую прадукцыйнасць працы, растучую жывёлагадоўлю.

Пачуццё павагі і радасці напаўняе нашы сэрцы, калі мы ад'язджаем з Усесаюзнай выстаўкі. Самае каштоўнае застаецца ў нашай памяці—гэта тое, што мы павінны змагацца за ўнядрэнне стаханаўскіх метадаў работы.

Прыехаўшы дамоў, у родныя калгасы, мы будзем актыўнымі агітатарамі і прапагандыстамі выстаўкі. Усё падрабязна раскажам, што бачылі, шырока разгорнем соцыялістычнае спаборніцтва за права ўдзелу ў выстаўцы 1940 года. У гэтым годзе з нашага раёна зацверджана ўдзельнікамі выстаўкі па ільну 43 калгаснікі. Агітацыйнай работай у калгасе, чэснай адданай працай, сіламі ўсіх калгаснікаў і калгасніц мы даб'емся значнага павелічэння ўдзельнікаў выстаўкі ў 1940 годзе. Памножым свае поспехі ва ўсіх галінах соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

**Ганна ГВОЗДЗІК, Марфа САПРАНОВІЧ, Мар'я БЕЗМОЗГАЯ, Тэкля КОНАНАВА, Ксення КАТОЎСКАЯ, Еўдокія ХРЫТОНАВА, Надзя СТАСЕВІЧ, Дар'я НОВАХРОСТ, Надзя ЧЭРНЯЎСКАЯ.**

**Група экскурсантаў Усесаюзнай сельска-гаспадарчай выстаўкі, з Крупскага раёна.**

# Гэта ёсць на самай справе

Працуючы ў павільёне БССР на Ўсесаюзнай выстаўцы, мы палюбілі сваю работу. Кожны дзень здаецца святам, калі сустракаешся з калгаснікамі, з майстрамі соцыялістычнага земляробства.

На выстаўцы ярка адлюстравана як Беларусь з адсталай, поўкаланіяльнай акраіны царскай Расіі ператварылася ў індустрыяльна-калгасную, суцэльна-пісьменную рэспубліку.

У мінулым беларуская жанчына акрамя гора нічога не бачыла. Яна была бяспраўная, забітая, непісьменная. Цяпер зусім іншае жыццё.

З дня адкрыцця выстаўкі праз павільён БССР прайшлі сотні тысяч людзей.

Ільнаводы з зацікаўленасцю разглядаюць экспанаты ільну, паказаныя ў аддзеле ільнаводства. Мысленна параўноўваюць з тым, што яны маюць у сваіх калгасах. Жывёлаводы падоўгу затрымліваюцца ля стэндаў, адведзеных паказу свінаводства і буйнай рагатай жывёлы. Кожны імкнецца пераняць стаханаўскі вопыт работы, перанесці яго ў сваю гаспадарку. На выстаўцы вялікі попыт на літаратуру, якая расказвае аб рабоце асобных гаспадарак, паказаных у павільёне.

Усеагульнае здзіўленне выклікаюць высокія ўраджаі, атрымоўваемыя з асушаных балот. Той, хто даўно не быў у Беларусі, недаверліва глядзіць на чатырохметравую каноплю, авёс у рост чалавека і багаты ўраджай траў, атрыманых з асушаных тарфянікаў. Сумненні знікаюць, калі да стэндаў балотных гаспадарак падыходзяць відавочцы цудоўнага ператварэння непраходных балот у высокаўраджайныя палі, лугі і пасбішчы. Яны кажуць: «Так, гэта ёсць на самай справе!» І запэўняюць прысутных канкрэтнымі лічбамі і фактамі.

**Экскурсаводы: ПАЛАЗКОВА М. К., КУЗНЕЦОВА Г. П.**

г. Масква.



1800 экскурсаводаў, прайшоўшых спецыяльныя курсы, азнаямляюць экскурсантаў выстаўкі з навейшымі совецкімі камбайнамі.
На здымку: экскурсавод т. Бродская (інжынер) растлумачвае экскурсантам Смаленскай вобласці камбайн „Сталінец". Фота Салавейчыка.

# Школа творчай працы

Вялікае ўражанне на мяне зрабіла выстаўка. Яна з'яўляецца сапраўднай стаханаўскай школай творчай працы вучоных, калгаснікаў і калгасніц.

Асабліва мне падабаўся павільён зерноводства. Там паказаны такія сарты пшаніцы, якія даюць надта вялікія ўраджаі. Спадабаецца мне таксама бавоўнаводства. Я яшчэ раз упэўнілася які багаты наш Совецкі Саюз.

У беларускім павільёне, таксама як і ў павільёнах другіх брацкіх рэспублік, адлюстравана багацце і ізабілле ўраджаяў ільну, канаплі і зернавых культур на калгасных палях.

Асабліва цікава работа вопытнікаў Беларусі па вырошчванню вінаграда. Ці марыў калінебудзь хто, каб ва ўмовах БССР магла расці такая культура?

Наогул выстаўка прадстаўляе сабой велізарны горад павільёнаў і пабудоў, насычаных экспанатамі розных прадуктаў, жывёлай, сельскагаспадарчымі машынамі, усім тым, чым займаецца наша калгасная вёска і яе людзі.

**ЗАГОРСКАЯ МАРЫЯ—экспанент Усесаюзнай выстаўкі ад соўгаса Зарэчча, Смалявіцкага р-на, узнагароджаная медаллю „За трудовую доблесть".**

# ВЯЛІКАЯ ДРУЖБА

11 жніўня група работніц Дзяржаўнай табачнай фабрыкі «Ява» прысутнічала на паказе самадзейнай народнай творчасці дэлегацыі соўгасаў і калгасаў Беларусі на Ўсесаюзнай выстаўцы.

Мы, работніцы табачнай фабрыкі «Ява», даем свой водзыў аб уражанні, атрыманым пры праглядзе ўсіх выступленняў. Пачынаючы з выступлення самага малодшага пакалення—7 і 8-гадовых крошак, і канчаючы выступленнямі прадстаўнікоў больш старшага пакалення, усё выклікала вялікую ўвагу і добрыя пачуцці.

Радасна было бачыць той гіганцкі рост нацыянальнай культуры, якога дабіліся працоўныя Беларусі. Ударна працуючы на палях сельскай гаспадаркі, павышаючы і памнажаючы ўраджаі, моладзь, дзеці і дарослае насельніцтва Беларусі растуць і культурна. І не дарэмна ў іх песнях гучаць словы: «Мы весела працуем і весела жывем».

Гэты вечар самадзейнасці надоўга застанецца ў нашай памяці, як вечар спайкі, вечар салідарнасці і дружбы народаў Совецкага Саюза.

**Работніцы фабрыкі „Ява": БАБРОВА, ПАНАМАРОВА, ФРАЛОВА, БАРЫСАВА.**

г. Масква.

# Шагай вперед комс

Рознастайна і цікава жыццё нашай шча
правамі вялікай Сталінскай Канстытуцыі н
ных фотаздымках паказаны асобныя момант
На здымку: 1—Лепшыя інструктары
кава М. У. Казлова і А. С. Чыкунова.
т. Югасёва адказвае на пісьмы сваім
Маскоўскага Архітэктурнага інстытута. 4
бзева са студэнткай завочнага Горнага інст
ным даследаваннем вугаляў. 5—Комсамол
Асінторфа т. Курачкіна за работай у ла
вым калектывам самадзейнасці завода. 6—
работае на камбайне (Рудзенскі р-н, Дубор
7—Вядомая фізкультурніца СССР т. Бок
чын па мотогонкам т. Гантман. 9.—Ленін
для цяжарных жанчын. 10—Быўшы
пасняхова скончыла курсы памочнікаў
цяжкавагавых цягнікоў. 11—Стаханаўка
зацни" Селезнева ў разведцы ў лагерах





# …мсамольское племя!

…нашай шчаслівай совецкай моладзі. Яна карыстаецца
…стытуцыі на працу, вучобу, адпачынак. На змешча-
…ныя моманты з будняў жаночай моладзі.
…структары-лётчыцы Мінскага Аэраклуба ім. Мола-
…ыкупова. 2—Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР
…ы сваім выбаршчыкам. 3—Студэнткі-дыпломніцы
…тытута. 4—Інжынер-геолаг, комсамолка Л. І. Сар-
…орнага Інстытута Е. М. Андрэевай за мікраскапіч-
…-Комсамолка-лабарантка вытворчай лабараторыі
…отай у лабараторыі. Яна кіруе танцавальна-харэ-
…завода. 6—Комсамолка-трактарыстка Смаляк Л. А.
…-н, Дуворскай МТС, калгас ім. X з'езда ЛКСМ.).
…Р т. …ркава. 8—Чэмпіёнка БССР сярод жан-
…—Ленінградская гасціная дома адпачынку ВЦСПС
…ўшы …кункавод дэпо Калінкавічы Е. Е. Гарбуз
…нікаў машыністаў і з'яўляецца выдатніцай ваджэння
…ханаўка швейнай фабрыкі „Знамя Индустриали-
…лагерах асоавіяхімаўцаў г. Віцебску.



2.



5



6



10



11.

# Вывучаюць гісторыю большэвіцкай партыі

Пастанова ЦК ВКП(б) ад 14 лістапада 1938 г. «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў)» з'яўляецца буйнейшай падзеяй у ідэйным жыцці большэвіцкай партыі. З паяўленнем у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» партыя атрымала новую магутную ідэйную зброю большэвізма, энцыклапедыю асноўных ведаў марксізма-ленінізма. Пастанова ЦК ВКП(б) адкрыла шырокае поле для праяўлення ініцыятывы з боку членаў партыі і непартыйных большэвікоў у адносінах самастойнай работы над сабой, над вывучэннем рэволюцыйнай тэорыі.

Метад самастойнага вывучэння гісторыі партыі дае выдатныя рэзультаты. Людзі па-новаму падыходзяць да паднящця свайго ідэйнага ўзроўню. Трэба падкрэсліць, што новы метад вывучэння гісторыі нашай партыі выклікае павышаную зацікаўленасць да аўладання тэорыяй, як у слухачоў, так і ў лектароў. Лекцыі прыходзяць слухаць у асноўным самастойна вывучаючыя гісторыю партыі. Яны задаюць лектарам рад пытанняў, на якія просяць даць грунтоўныя адказы.

Усё гэта прымушае асабліва сур'ёзна рыхтавацца да лекцый. Не гледзячы на тое, што лекцыі прыходзіцца на адну і тую-ж тэму чытаць па некалькі разоў, трэба дадаткова кожны раз рыхтавацца да іх. Высокаякасныя лекцыі заўсёды ацэньваюцца слухачамі як след. Асабліва задаволенне адчуваеш, калі аудыторыя цябе слухае ўважліва.

Мы маем у сучасны момант выяўленыя кадры партыйных і непартыйных большэвікоў, якія з выключным інтарэсам узяліся за вывучэнне гісторыі партыі і маюць значныя рэзультаты ў гэтых адносінах.

Трэба сказаць, што сярод людзей, якія сур'ёзна ўзяліся за аўладанне асновамі марксізма-ленінізма нямала жанчын. Узяць напрыклад т. Дабравольскую—работніцу фанернага завода. Яна сур'ёзна ўзялася за вывучэнне гісторыі партыі. На пытанне сакратара партарганізацыі—хто жадае падрыхтаваць тэарэтычны даклад для тэарэтычнай канферэнцыі—яна першая заявіла: «Я буду рыхтавацца і выступлю на тэарэтычнай канферэнцыі з дакладам. Я лічу, што гэты метад дапаможа мне сапраўды сур'ёзна ўзяцца за вывучэнне тэорыі нашай большэвіцкай партыі».



У Гомельскім Доме партасветы. Комуністы за вывучэннем тэорыі большэвізма. На пярэднім плане: Д. В. Шэхтман—майстар цэха шчацiннай фабрыкі.

Фота—А. Р. Шаевіч (Фотахроніка БЕЛТА)

Трэба сказаць, што ў т. Дабравольскай словы не разыходзяцца са справай: пасля ўзмоцненай работы тав. Дабравольская выступіла з грунтоўным дакладам. Адчувалася, што яна многа папрацавала і даклад зрабіла зусім добра.

Трэба падкрэсліць, што тэарэтычныя канферэнцыі далі магчымасць выявіць таленавітых прамоўцаў. Даклад жанчыны—ўрача-хірурга тав. Кліменко на тэарэтычнай канферэнцыі работнікаў Медсанпрацы па пытанню «Пачатак рэволюцыйнай дзейнасці Леніна і Пецербургскі Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа» быў выслухан з велізарнейшай увагай. Тав. Кліменко добра падрыхтавала свой даклад. Яна змагла прыпаднесці яго вельмі цікава.

Можна прывесці многа прыкладаў, якія сведчаць аб зацікаўленасці вывучэннем гісторыі партыі з боку жанчын у партарганізацыі маслазавода. Парторг маслазавода тав. Левелева змагла паставіць вывучэнне гісторыі партыі так, што іх калектыў з'яўляецца перадавым. З работы тав. Мільхман (работніца фанернага завода) і цэлага раду іншых жанчын, мы бачым, што нашы совецкія жанчыны з нязменшай цікавасцю, чым мужчыны, узяліся за вывучэнне гісторыі партыі.

Жанчыны Совецкага Саюза—роўнапраўныя. Яны прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх галінах палітычнага, гаспадарчага і грамадскага жыцця, а каб сапраўды справіцца са сваёй работай, ім неабходна авалодваць тэорыяй марксізма-ленінізма.

**Лектар Віцебскага Гаркома партыі З. ГІЛІНА.**

# НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД СУСТРАКАЕМ ПАДРЫХТАВАНА

Комуністычная партыя і Савецкі ўрад удзяляюць вялікую ўвагу справе народнай асветы, справе марксісцка-ленінскага выхавання нашага маладога, падрастаючага пакалення. Яскравым доказам гэтага служаць гістарычныя пастановы аб школе, штодзённыя клопаты вялікага Сталіна аб савецкім настаўніку і шчаслівай нашай дзетвары.

Калі раней да 1917 года ў Парыцкім раёне было пяць пачатковых школ, то цяпер у адных толькі Парычах ёсць дзве сярэднія школы, у якіх навучаецца больш тысячы дзяцей.

Як-жа Парыцкая сярэдняя школа № 1 падрыхтавалася ў гэтым годзе сустрэць вучняў? Адразу-ж, пасля скančэння вясенніх іспытаў, распачаўся рамонт школы. Не глядзячы на тое, што вучні прывучаны берагчы школьную маёмасць, а адсюль і класы былі чыстыя, у гэтым годзе зноў зрабілі пабелку сцен, афарбавалі падлогі, утварылі рамонт школьнай мэблі.

Вучні прыдуць ва ўтульныя, светлыя і чыстыя класы, упрыгожаныя партрэтамі правадыроў і плакатамі. Закуплена вялікая колькасць падручнікаў, набыты геаграфічныя карты, гістарычныя карціны і іншыя наглядныя дапаможнікі.

Школьны фізічны кабінет, які мае вялікую колькасць фізічных прылад, у гэтым годзе зноў папоўніцца навейшымі прыборамі. Школа мае добрую бібліятэку. Усё-ж у гэтым годзе для яе закуплена многа кніг.

Дырэктар школы тав. Пэйзнер, з'яўляецца добрым гаспадаром. Школа на ўвесь навучальны год забяспечана апалам, крэйдай. Для вучняў і настаўнікаў створаны ўсе ўмовы для таго, каб забяспечыць добраякаснае правядзенне лекцый. Усе настаўнікі маюць кватэры.

Цяпер справа залежыць толькі ад нас саміх—настаўнікаў і вучняў. З першага дня заняткаў трэба добрасумленна і сур'ёзна ўзяцца за работу, каб апраўдаць ганаровае званне чырвонасцяжнай школы. Моцна трымаць чырвоны сцяг, не аддаючы яго нікому.

З пачуццём глыбокай радасці і хвалявання прачытала я пастанову Совета Народных Камісараў БССР аб прысваенні мне звання заслужанай настаўніцы школы.

Выхоўваць наша маладое пакаленне ў духу бязмежнай любві да сваёй цудоўнай радзімы, партыі, народу, у духу непрымірымасці да ворагаў народа, выхоўваць новага чалавека—задача вялікая і ганаровая.

Аказанае мне партыяй і ўрадам давер'е і гонар я пастараюся апраўдаць.

**О. КАСЦЮКЕВІЧ.**
**Настаўніца-ордэнаносец.**
Парычы.



Совет народных Камісараў Беларускай ССР за выдатныя заслугі ў галіне выхаваўча-педагагічнай дзейнасці, прысвоіў 80 настаўнікам Рэспублікі званне заслужанага настаўніка школы.

На здымку: група настаўнікаў школ г. Мінска, якім прысвоена званне. Злева направа: Л. В. Ліхачова, Л. І. Цвірко, А. І. Невінская, С. Ф. Науменко, Р. Г. Барам і А. А. Чэрняўскі.

Фота В. А. Баранава і А. І. Панькова (Фотахроніка БЕЛТА).

# Як я рыхтавалася да заняткаў

Першага верасня пачынаюцца заняткі. Школы запоўняцца бадзёрай, адпачыўшай за лета дзетварой. З новымі сіламі вучні прымуцца за вучобу.

Мы, настаўнікі, павінны падрыхтавацца да пачатку заняткаў. Для гэтага неабходна прадумаць план сваёй работы, набыць неабходныя падручнікі і літаратуру.

У гэтым годзе я ўпершыню буду выкладаць рускую мову і літаратуру ў шостым класе. Дваццаць год працавала ў малодшых класах і чатыры годы ў пятым класе. Я многа папрацавала за лета і добра падрыхтавалася да навучальнага года. Дэталёва прадумала праграму для шостага класа ўсю і па асобных раздзелах. Склала прыкладны план на год. Многа прачытала адпаведнай літаратуры. Закупіла неабходныя для сябе падручнікі, якімі буду карыстацца ў часе работы. Склала рабочы план на першую шасцідзёнку. У гэтым плане прадугледзіла ўсе дэталі, каб урокі былі жывымі і цікавымі.

— Я класны кіраўнік. Увосень прыдуць да нас новыя дзеці. Стаўлю перад сабой мэту—прывіць дзецям любоў да настаўніка, трымаць з ім цесную сувязь і штодзённа весці сярод вучняў выхаваўчую работу. Буду выхоўваць дзяцей у духу патрыятызма, адданасці справе Леніна—Сталіна, буду выхоўваць з іх стойкіх бальшэвікоў, якія-б ненавідзелі ворагаў і ўмелі іх распазнаваць.

З 155 маіх вучняў двое будуць трымаць іспыты ўвосень. Я займаюся з імі ўсё лета і ўпэўнена, што мая работа не прападзе дарэмна,—яны вытрымаюць іспыты.

Наша 19-я школа добра падрыхтавалася да новага навучальнага года. Скончаны рамонт школы і мэблі. У класах чыста, прыгожа і ўтульна.

Апошнія дні прынеслі мне вялікую радасць. Урад БССР прысвоіў мне званне заслужанай настаўніцы школы. Гэта высокае званне ўліло ў мяне свежыя сілы і энергію. Мне 56 год, адчуваю сябе добра. З усёй адданасцю буду працаваць яшчэ лепш, каб апраўдаць ганаровае званне.

**Настаўніца 19-й школы Антаніна Іванаўна НЕВІНСКАЯ.**

г. Мінск.



7 жніўня ў вышэйшых навучальных установах БССР пачаліся прыёмныя іспыты.

На здымку: вучаніцы Быхаўскай сярэдняй школы. Злева направа: Дзергачова А. С. і Свідэрская В. Я. здаюць іспыты па пісьмовай беларускай мове ў Медінстытут.

Фота Казловіча.

В. Гуцько

## НАСЦЯ

Ля балот, дзе спрадвеку пустка
У абдымках вятроў сіпела,—
Канаплянік узняўся густа
І апошнімі днямі даспее.

Выбіраюць жанкі браніцы,
Выбіраюць ахвотна, толкам;
І калгаснікі будуць дзівіцца
Валакном канапельным тонкім.

Яго фабрыкі будуць прасці,
З яго будуць палотны ткацца;
І пахваляць рабочыя Насцю
За выдатную якасць працы.

Насця знае—
У сэрца свету,
У Маскву,
Валакно, на дзіва
Павязе яна тэтым летам,
Павязе на паказ радзіме.

Яе цешыць такое імкненне,
Напаўняе агнём, здаецца;
І тады яна ордэн Леніна
Прыцісквае мацней да сэрца.

Зноў падыйдзе вялікі Сталін
І руку ёй пацісне шчыра.

. . . . . . . . .

Насця ў светлай задуме стала
Пад напеў канаплянай шыры.

Сінь палёў прарастала змрокам,
І асокі туманам моклі...
У Настулі на кожным кроку
Прад вачыма стаяць канаплі.



Аргкамітэт Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР на Палескай Области арганізаваў у Мазыры 3-х месячныя курсы па перападрыхтоўцы старшынь сельсоветаў, інструктароў райвыканкомаў і сакратароў сельскіх советаў.

На здымку: курсанты за падрыхтоўкай да заняткаў па кароткаму курсу гісторыі ВКП(б). Злева направа: М. С. Легвіна, А. М. Пехото, Т. Е. Ефіменко і Ф. Д. Даніловіч.

Фота Б. М. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА)

# Калгасны конюх

Еўдакімчык Маша ўпершыню прышла на канюшню ў 1936 годзе. Некаторыя калгаснікі сустрэлі яе прыход з насмешкай. Праўда, яны ведалі Машу, як сур'ёзную, сумленную і працавітую жанчыну, але ў поспех работы яе на канюшні не верылі.

— Як ні кажыце—жанчына! Не бабская гэта работа,—цішком пагаварвалі мужчыны і тутжа пра сябе дадавалі:—Ёй-бы курэй гадаваць, свіней ці кароў... Гэта любая жанчына зможа. А жарабяты... Ого, надта сур'ёзная штука. Мужчына павінен гэту пасаду займаць...

Але размовы не палохалі Машу. Яна імкнулася даказаць на практыцы памылковасць поглядаў, паказаць на справе, што жанчына бадай не горш за мужчыну можа справіцца з работай на канюшні. Еўдакімчык з усёй энергіяй узялася за справу. Яна добра ўяўляла сабе, што поспех залежыць ад чэсных, любоўных адносін да сваёй работы.

Хутка Маша пераканалася, што догляд жарабят не такая ўжо складаная і цяжкая работа. Своечасова накарміць, напаіць, вычысціць, выгнаць на пашу, зімой на прагулкі—вось тыя асноўныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца конюху.

Вялікую дапамогу Машы аказваў вопытны конюх Міхей Масарноўскі. Ён доўгі час працаваў конюхам і, як рупліvы чалавек, да тонкасцей вывучыў норавы і капрызы коней, добра ведаў, як абыходзіцца з імі. Яго падтрыманне і парады акрылялі Машу, усялялі ўпэўненасць і веру ў перамогу. Дбайная, клапатлівая Маша хутка адчула, што новую работу пачынае асвойваць, а яе выхаванцы-жарабяты зрабіліся для яе блізкімі і разумнымі істотамі.

Яна таксама добра ведае, якое велізарнае значэнне мае конь у калгаснай гаспадарцы і абароне краіны. Калі ў 1937 годзе захварэла трое жарабят, яна два тыдні пяшчотна даглядала іх. Маша актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці калгаса. Яна акуратна чытае газеты, цікавіцца міжнародным становішчам.

Яна радуецца, бачучы плады сваёй працы. Сапраўды ёсць чаму радавацца! У 1938 годзе яна выгадавала і захавала ўсіх атрыманых з фермы жарабят.

У гэтым годзе Маша гадуе новую партыю ў колькасці 16 штук. Жарабяты добра выглядаюць, яны чыстыя, гладзенькія. Маша ходзіць каля іх як вопытны і ведаючы сваю справу чалавек. Тры годы не прапалі дарма. Практыка, жыццё—гэта добрая школа.

Так Маша—радавая жанчына—калгасніца стала вопытным конюхам, знатным чалавекам, якая вядома далёка за межамі раёна. Зараз нават і тыя, якія не верылі ў яе сілы, перасталі шушукацца, бо яны могуць павучыцца ў Машы Еўдакімчык, як трэба па-гаспадарску адносіцца к захаванню і вырошчванню коней. За чэсную і адданую работу ў калгасе Наркамзем БССР прэміраваў у 1937 годзе т. Еўдакімчык. У мінулым годзе яе прэміравалі аблза і райза. У яе наладжана перапіска з начальнікам конеупраўлення і намеснікам наркома земляробства БССР.

Нядаўна Еўдакімчык прынята ў кандыдаты партыі Леніна—Сталіна. Расказваючы аб вялікай і радаснай падзеі ў сваім жыцці, яна кажа: «Маё ўступленне ў кандыдаты бальшэвіцкай партыі накладае на мяне новыя абавязкі. Я павінна працаваць яшчэ лепш, каб на практычнай рабоце апраўдаць вялікае званне члена партыі».

За добрыя паказчыкі па вырошчванні і гадоўлі жарабят Еўдакімчык Маша залічана ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Цяпер яе мара—пабываць у Чырвонай сталіцы Маскве, сустрэцца з лепшымі людзьмі нашай краіны, пераняць лепшы вопыт іх работы.

**П. Рунец.**

Бярэзінскі раён, калгас імені Мяснікова.



Даманавіцкая МТС датэрмінова выканала гадавы план камбайнавай уборкі ураджаю.

На здымку: лепшая камбайнерка МТС, кандыдат партыі Тацяна Старавойтава, убраўшая паўночным камбайнам 220 га.

Фота В. М. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).



# Лакшамі

*(Апавяданне)*

Пачуўся шолах, жанчына ўздрыганулася.

— Ён ідзе,—падумала яна і паспешна пачала завіхацца каля ляжанкі. Склаўшы ў торбу кукурузныя ляпёшкі, некалькі жмень пазычанага рысу, вязку сушанай рыбы, якую берагла на ўрачыстасць Лакшамі прыслухалася. За шыбамі з паперы, якія выходзілі ў двор, абнесены глінянай сцяной, ціха шумеў вецер. Здавалася, паветра гудзе безупынна, так было яно насычана за дзень грукатам узрываў і страляніны. Крокаў не было чуваць. Трывога ахапіла Лакшамі.

— Чаму Лі-чэна няма? Ён-жа прыйсці абяцаў. Што здарылася?

Хвалюючыся, яна вышла з фанзы. Светлы месяц, што гойдаўся ў кучаравых воблаках, глядзеў на даліну, нібы прыжмураным вокам. Шырокі твар Лакшамі, асветлены месяцам, здаваўся яшчэ больш жоўтым і яскравейшым быў доўгі, тонкі шрам. Лакшамі пільным позіркам вузкіх карых вачэй угледалася ў далечыню. Цесныя крывыя завулкі былі брудныя і ціхія. З-за гліняных сцен выглядвалі чаротавыя ці саламяныя дахі, а зрэдку і прыгожыя, з загнутымі краямі, дахі багатых дамоў.

— Няма яго... Ці жывы хаця, ці ўбачыць яшчэ раз свайго любага сына, ці галава яго знойдзе спакой побач з продкамі на могілках — неадчэпна свярлілі мозг трывожныя пытанні. Нарэшце стомленая Лакшамі вярнулася ў фанзу і моўчкі села на дол каля цыноўкі, падгарнуўшы накрыж ногі. На цыноўцы спаў яе трохгадовы сын. Лакшамі прыслухоўвалася да яго роўнага дыхання. Падпершы галаву рукой, яна мерна хісталася ў цяжкім роздуме. Неўзабаве ёю авалодала дрымота.

Перад вачыма, скованай дрымотаю Лакшамі, паплылі, нібы жывыя, малюнкі з яе жыцця. Вось яна бачыць сябе пятнаццацігадовай дзяўчынкай на чайнай плантацыі ў пана. Спякотны дзень. Сонца абпаліла худыя плечы і рукі дзяўчынкі, у галаве гудзіць, цела бяссільнае. Ногі Лакшамі падгінаюцца самі. Ёй захацелася хоць на хвілінку схаваць распаленую галаву ў цені куста. Лакшамі здавалася, што ад гэтага адразу перастане балець цела. Яшчэ гэтая думка яскрава не акрэслілася ў галаве дзяўчынкі, як яна бездапаможна звалілася на куст чаю. Наглядчык заўважыў і коршунам кінуўся да яе. Яго злосны, распалены сонцам, тлусты твар з хрыпам і лаянкай нахіліўся над дзяўчынкай. Яна раскрыла вочы і спалохаўшыся паімкнулася ўстаць, але раптам—бы распаленым жалезам апякло ёй спіну і твар. Кроў заліла вочы.

Расказвалі людзі, што ў той-жа момант на наглядчыка, нібы барс, кінуўся Лі-чэн, самы прыгожы і дужы хлапец у вёсцы. Схапіўшы за горла пана-наглядчыка Лі-чэн давіў яго, пакуль той пасінеў.

Далей Лакшамі бачыць маршчыністы ў слязах твар маці, неразумеючыя здзіўленыя вочы малых братоў.

Калі яна выздаравела, Лі-чэна не было ў вёсцы—ён хаваўся ад расправы. Наглядчык адмовіўся чакаць, пакуль бацька Лі-чэна выплаціць яму доўг, і канфіскаваў увесь іх бядняцкі скарб. Гэтая помста асудзіла сям'ю Лі-чэна на жабрацтва. Затаіўшы вялікую злосць і нянавісць да ворагаў, Лі-чэн вярнуўся, каб сваёй працай карміць сям'ю. Цяпер Лакшамі была прыгожай сталай дзяўчынай.

— Няўжо гэта ты Лакшамі?—здзівіўся Лі-чэн, пабачыўшы яе ў першы раз пасля доўгай сваёй адсутнасці.

— Так, гэта я,—ціха адказала яна, апусціўшы вочы. Пасля гэтай сустрэчы павага і ўдзячнасць, што былі ў дзіцячым сэрцы перарадзіліся ў глыбокае шчырае каханне. Яна гатова была зрабіць нешта гераічнае, вялікае—для яго.

Аднойчы Лакшамі атрымала падарунак ад Лі-чэна—гэта азначала, што ён выбірае яе ў жонкі. Сышліся бацькі, дагаварыліся. Праз некалькі дзён вечарам Лі-чэн адвёў Лакшамі ў фанзу сваіх бацькоў. Жылі яны бедна, але дружна, падзяляючы радасць і гора, якое здавалася лягчэйшым, калі было яго з кім падзяліць. Нядоўгае ў бедняка шчасце. Двое дзяцей Лакшамі памёрлі ў часе эпідэміі. Кругом пачалі рыскаць японскія атрады, грабячы мізэрныя запасы кітайскіх беднякоў, спусташаючы палі і сяленні.

Кітайскі народ паслаў сваіх сыноў бараніць радзіму. Пайшоў і Лі-чэн, пакінуўшы Лакшамі з маленькім сынам. У гэтую ноч ён абяцаў прыйсці на гадзіну з гор, каб праведаць, што робіцца ў вёсцы і абняць сына. Цэлую ноч Лакшамі не спала, чакаючы мужа. Вось пракрычалі апошнія пеўні. Змрок адлятаў у горы, шэрань неба святлела, а Лі-чэн не прыходзіў. Трывога і страх за любага апанавалі Лакшамі. Яна не знаходзіла сабе месца. Сэрца рвалася туды, дзе магчыма паміраў Лі-чэн. Лакшамі здавалася, што яна бачыць яго акрываўленым, праткнутым штыхам. Твар яе збялеў, слёзы стаялі ў вачах.

Зарыпелі дзверы ў суседніх фанзах, а клумак, падрыхтаваны Лакшамі ляжаў па-ранейшаму, ды сын усміхаўся ў ва сне.

Раптам густы роў наплыў на вёску, быццам рушыў горны абвал. Лакшамі выбегла на вуліцу. Неба было цёмным ад сталёвых птушак.

З жахам Лакшамі кінулася ў фанзу, дрыжачымі рукамі схапіла спаўшага сына, моцна прыціснула да грудзей і пабегла.

— К людзям, к людзям, з імі не так страшна, як адной, шаптала Лакшамі.

Хлопчык спуджана пазіраў чорнымі вочкамі. Яго пухленькі смуглявы твар быў яшчэ ружовы ад сну. Дзіцячае сэрца білася бездапаможнай птушкай. Маленькімі ручкамі, што меў сілы, ён абхапіў матчыну шыю і схаваў твар на яе грудзях.

Бегчы было немагчыма: здавалася, што густыя хмары аселі на зямлю. Жанчына задыхалася ў дыму і пылу, але не спынялася. Грукат узрыву аглушыў яе так, нібы столь дагарэўшага дома звалілася. Лакшамі ўпала, хлопчыка адкінула ад яе. Калі вятры развеялі дым і аселі тоўстым слоем пыл, пясок, каменне. тады людзі кітайскай вёскі з роспаччу пачалі шукаць сярод абломкаў і дымячых галавешак целы родных.

Лакшамі знайшлі пад абломкамі і пылам ляжачай на спіне з раскінутымі худымі рукамі. Замест адзёжы на ёй былі чорныя абрыўкі. Твар быў шэры і па ім вузкай істужкай цякла кроў, змешваючыся з пылам.

Лакшамі была жывая. Яе аднеслі ва ўцалеўшую фанзу, паклалі на цыноўку і прыставілі назіраць старуху.

Людзі знаходзілі целы забітых скалечанымі да непазнавальнасці, а то знаходзілі акрываўленыя часткі: рукі, ногі ці палову цела. Жудасны плач плыў над развалінамі сяла, заміраючы недзе ў горах. Калі Лакшамі ачнулася, яна не ведала, што з ёй і першымі яе словамі былі:

— Дзе мой сын?

Забілі праклятыя японцы,— пачуўся адказ.

Лакшамі бяссільна апусцілася на зямлю і цяжка плакала без слёз, уздрыгваючы ўсім целам. Яна згубіла прытомнасць. Пасля доўгіх намаганняў яна ажыла; буйныя слёзы паліліся па змучанаму твару, аблягчаючы дыханне сціснутым горам грудзям. Было цяжка глядзець на вялікае няшчасце маці, згубіўшай адзінага сына.

— Яснае сонца маё, прыгожая кветка, чаго ты не ідзеш да сваёй маці, ці не чуеш яе стогну, ці не бачыш горкіх слёз? О, праклятыя, яны забілі сына. Ён не прыхіліцца больш да матчынай грудзі,—роспачна прычытвала Лакшамі.

Назаўтра вёска хавала забітых. Над магіламі багатых бялелі помнікі, якія былі абнесены гліняными сценамі і абсажаны кіпарысамі. Удовы рвалі з галавы валасы і раздзіралі кіпцямі твар. Ад плачу матак, жонак, сясцёр дрыжэлі кіпарысы.

Усе былі скаваны цяжкім горам і не заўважылі, як на ўзвышанасці апынуўся чалавек. Гэта быў кітайскі студэнт. Вайна прымусіла яго змяніць кнігу на вінтоўку. Яго шчуплая постаць была поўна імклівага энтузіязму. Вочы рухавыя, іскрыстыя. Ён, здавалася, увесь гарэў жаданнем барацьбы. Студэнта заўважылі толькі тады, калі яго палкая прамова ўварвалася ў жалобны плач сірот.

Студэнт гаварыў так ярка, што людзі эразумелі прычыну тых жудасных малюнкаў смерці,



разарэння і здзеку, якія ім прышлося перажыць. Скончыў ён пераканаўчую прамову заклікам:

— Я да вас звяртаюся, мужныя кітайцы! Вораг адплоціць няхай сваёй гібеллю за жыццё нашых дзяцей, за кроў нашых братоў! Кітайцы, зброю вазьміце! Горда зірніце ў вочы смерці, бо смерць у пакорнасці—ганьба, трусасць. Хто за мной?

На момант устанавілася цішыня. Потым адзін за другім пачалі падыходзіць маўклівыя і гнеўныя пажылыя людзі і нястрымныя юнакі. Дарослыя былі ўжо на фронце.

— Больш няма?—Студэнт праніклівым поглядам глядзеў на натоўп. Засталіся жанчыны ды зусім старыя людзі.

Зноў некаторы час было напружанае чаканне, нарушанае гулам здзіўлення. Да ішоўшых на фронт з упэўненай рашучасцю ішла Лакшамі.

— І я іду, мне няма больш чаго тут рабіць, а там я можа патрэбна...—А за ёй адна за другой падыходзілі маладыя жанчыны і станавіліся ў рады.

Атрад гэты быў рознастайны і па ўзросту і па неаднолькавай здатнасці да барацьбы, але ён быў спаяны адзіным жаданнем помсты. Яны ішлі ў горы да партызанскага атраду, што быў пад камандай Лі-чэна. Прыходзілася прабірацца праз зараслі кізільніку, піхты. Сцежка была вузкая, то паднімалася крута ўгору, то спадала абрывістым спускам. Часамі яна ішла паўз пропасць ці рабілася камяністай. Цярпліва і мужна выносілі ўсе цяжкасці жанчыны. Яны ішлі на змаганне за незалежнасць, за мір, за шчаслівую долю сваіх дзяцей.

**Любоў Закс—пачынаючая пісьменніца.**

# «ДРУГОЕ БАКУ»

„Стварыць у раёне паміж Волгай і Уралам новую нафтавую базу—„Другое Баку" (з рэзалюцыі XVIII з'езда ВКП(б) па дакладу тав. В. Молатава)".

Наша краіна па сваіх нафтавых рэсурсах з'яўляецца багацейшай краінай у свеце. За апошнія годы шырока разгарнулася разведывацельная работа. У пошуках нафты мы забраліся ў горы Урала, у Сярэднюю Азію, Сібір і нават турбуем марское дно ля Баку.

Важнейшым вынікам перамог у нафтаздабычы з'яўляецца развіццё новых нафтаздабываючых раёнаў. Наша радзіма цяпер, як ніколі, насычана маторным паркам. Існуючае да апошняга часу палажэнне, калі патрэбы соцыялістычнай гаспадаркі ў нафце пакрываюцца на 75—80 процантаў за лік каўказскай нафты, пераважна за лік Баку, нас далей задаволіць не можа. Загрузка транспарта дальнімі перавозкамі нафты і звязаныя з гэтым значныя цяжкасці могуць адбіцца на развіцці народнай гаспадаркі, асабліва на Усходзе. Значэнне развіцця новых нафтавых баз сфармуліравана было таварышам Сталіным яшчэ на XVII з'ездзе партыі. Таварыш Сталін указаў на неабходнасць «узяцца сур'ёзна за арганізацыю нафтавай базы ў раёнах заходніх і паўднёвых спадаў Уральскага хрыбта». Гэта ўказанне правадыра народаў адыграла выключную ролю ў справе развіцця новага раёна нафтаздабычы паміж Волгай і Уралам.

Яшчэ ў XVIII веку акадэмікі Лепехін і Палас указалі на адзнакі нафты ў раёне паміж Уфой і Самарай. А. П. Карпінскі прышоў к заключэнню, што нафта ёсць у нетрах Рускай раўніны.

Але царская ўлада не цікавілася пошукамі вучоных. Яна не заахвочвала разведвацельных работ, а наадварот, душыла ўсякія новыя пачынанні, адкрыцці.

Толькі пры совецкай уладзе была даказана правільнасць прагноза вучоных. 16 красавіка 1929 года нечакана ўдарыў нафтавы фантан з скважыны № 20, прабуранай у Чусаўскіх гарадках (70 км ад Пермі). Там шукалі калійныя солі, але знайшлі нафту. Гэта скважына—«бабушка», як часта называюць нафтавікі,—паклала пачатак развіццю «Другога Баку»—волжска-уральскай нафтавай прамысловасці.

У 1932 г. у аколіцах Стэрлітамака (Башкірыя) была выяўлена нафта. У 1934 годзе бурылі скважыну для артэзіянскага калодзежа на тэрыторыі Комскага папяровага камбіната. З глыбіні ў 175 м замест вады пайшла нафта. У 1936 годзе калгаснікі вёскі Садка, каля Бугуруслана (Чкалаўская вобласць), капалі склеп і наткнуліся на багатыя пласты асфальцітаў. Пачаліся пошукі і потым была выяўлена лёгкая нафта. У 1937 годзе ў Башкірыі, каля сяла Туймазы, быў адкрыт магутны нафтавы басейн. Скважына новага басейна давала ў першыя-ж дні эксплаатацыі па 500 тон у суткі.

*Такім чынам, паміж Волгай і Уралам выяўлен рад новых месцанараджэнняў нафты.* Указанне таварыша Сталіна аб развіцці нафтавай базы на Ўсходзе ператвараецца ў жыццё. У той перыяд (1934 г.) на Волжска-Уральскіх месцанараджэннях толькі ішла нафтаразведка і нязначная здабыча, а цяпер тут разгарнулася вялікая работа па прамысловай здабычы нафты. У 1938 годзе было здабыта 1,3 млн. тон нафты супроць 34 тысяч тон у 1933 г. За 5 год здабыча павялічылася амаль у 4 разы. Урал, Сібір і Далёкі Усход ужо атрымліваюць значную частку патрэбнай ім нафты з новага Урала-Волжскага нафтавага раёна. У 1942 годзе гэты раён павінен даць 7 мільёнаў тон нафты, амаль столькі, колькі здабылі ў 1937 г. такія сусветныя нафтаздабываючыя краіны, як Мексіка, Румынія ці Галандская Індыя.

Калі Баку ў перыяд зараджэння там нафтавай прамысловасці даваў за пяцігоддзе (1865—1869 гг.) па 15 тыс. тон у год, то Туймаза ўжо ў 1938 г. дала 21 тысячу тон, у гэтым годзе павінна даць 80 тысяч тон, а ў канцы трэцяй пяцігодкі—1942 г.—1 млн. тон.

Толькі соцыялізм ставіць прыроду, багацейшыя яе дары на службу ўсяму працоўнаму народу. Толькі ў СССР прыродныя багацці, адкрываемыя чалавекам, ідуць для блага ўсёй краіны.

СССР па ўзроўню здабычы займае 2 месца ў свеце (пасля ЗША). Але патрэбы нашай радзімы ў нафце бязмежныя. Шырока развіваючы здабычу нафты ў слаўным ордэнаносным Азербайджане, які быў і застаецца сапраўднай жамчужынай соцыялістычнай гаспадаркі, мы адначасова ўсямерна развіваем, будуем і асвойваем новы малады раён—«Другое Баку».

Указанне, данае вялікім правадыром таварышам Сталіным, ажыццяўляецца,—«Другое Баку» ствараецца рукамі большэвікоў.

**Б. Ліберман.**



Прыёмшчыцы-стаханаўкі друкарні імя Сталіна К. К. Жыдовіч (злева) і Б. І. Зельмановіч за прыёмкай гатовых падручнікаў.

Фота Л. А. Мазелева (Фотахроніка БЕЛТА)

# Беражыце зубы

Дрэнна пераважаваная і недастаткова насычаная сліною ежа горш паддаецца апрацоўцы страўнікавым сокам і ў вялікай колькасці паступае ў кішэчнік неператраванай, ствараючы тым спрыяючую глебу для бражэння і размнажэння мікробаў.

Яшчэ горш абстаіць справа, калі ў роце ёсць гніючыя зубы і гнілыя карані. Дуплы гніючых зубоў з'яўляюцца расаднікамі ўсялякіх мікраарганізмаў, сярод якіх нямала ўзбуджальнікаў такіх хвароб, як дыфтэрыт, тыфус, сухоты. Ад гніючых зубоў і каранёў могуць развівацца розныя хваробы ў поласці рота. Асабліва небяспечна для жыцця гнойнае запаленне пад'язычных залоз. Пад падбародкам з'яўляецца цвёрдая пухліна, такая вялікая, што шыя зраўноўваецца з падбародкам. Корань языка пухлінаю ўзнімаецца ўгару і прыціскаецца да нёба, ствараючы цяжкасці пры глытанні. Гэтая мучыцельная і цяжкая хвароба носіць назву ангіны «Людовіка».

У выніку неахайных адносін да зубоў часта з'яўляецца гніенне чэлюснай касці з абезабражваючымі твар знадворнымі свішчамі, з якіх выдзяляецца гной. Узнікае гнойнае запаленне сярэдняга вуха, флегмона вочніцы, гнойнае запаленне калявушнай залозы. Мучыцельная зубная боль не дае чалавеку ні піць, ні есці, ні спаць, ні працаваць.

Не менш прыгнятаюча дзейнічае на кожнага і сазнанне свайго хворага роту, калі замест здаровых белых зубоў тырчаць упрамешку з пустотамі цёмныя папсаваныя зубы, а з роту даносіцца дрэнны пах. З такім ротам цяжка зрабіць добрае ўражанне на акружаючых. Які-б чалавек ні быў разумны, прыгожы, добра адзеты, усё-ж атрымліваецца ўражанне неахайнасці і некультурнасці.

У пераважнай большасці выпадкаў можна пазбегнуць усіх гэтых непрыемнасцей, захаваць зубы здаровымі.

Каб удаліць харчовыя рэшткі, якія асталіся паміж зубамі, неабходна раніцою і на ноч чысціць зубы шчоткай і пасля кожнай яды прапаласківаць рот. Чысціць зубы трэба не ў гарызантальным напрамку ад вуха да вуха, а зверху ўніз і наадварот. Шчотка не павінна быць надта жорсткай. Гэта рэкамендуецца толькі там, дзе зубы вельмі забруднены, або маецца сільнае адкладанне зубнога каменя, прычым і ў гэтым выпадку не рэкамендуецца пастаянная чыстка жорсткай шчоткай, бо ад гэтага можа выцерціся эмаль на шыйцы зубоў, дзе яна ляжыць тонкім слоем. У каго зубы ў добрым становішчы, таму непатрэбна пастаянна ўжываць зубны парашок. Дастаткова прачысціць зубы мыльнай шчоткай і выпаласкаць рот.

З якога ўзросту трэба пачынаць чысціць зубы? Чым раней, тым лепш. Для дзяцей добры жавальны апарат яшчэ больш патрэбны, чым для дарослага, бо харчаванне з'яўляецца неабходнай умовай росту і фармавання арганізма. Пагэтаму дзецям з ранняга ўзросту трэба прывучацца валодаць зубной шчоткай. Чыстка зубоў і паласканне роту павінны стаць для іх такой-жа неабходнасцю, як мыццё твару і рук.

Добра захоўваюцца зубы ў тых, хто любіць сухары, чорствы хлеб і наогул дае работу зубам. Цвёрдая ежа ўмацоўвае іх. Выконваючы сваё прыроднае прызначэнне, энергічна раздрабляючы, расціраючы ежу, зубы лепш харчуюцца, дзякуючы правільнай цыркуляцыі крыві ў карнявой часці зубоў знішчаецца застой у дзёснах.

Захаванне зубоў і цэласць іх залежыць таксама ад агульнага становішча арганізма. Людзі з добра развітай коснай сістэмай, як правіла, маюць добра развітыя зубы.

Пагэтаму ўсё тое, што спрыяе агульнаму ўмацаванню, умацоўвае і зубы. Сонца, вада, паветра, фізічныя практыкаванні, палявыя работы, фізкультурныя заняткі, вясёлы, бадзёры настрой,—усё, што спрыяе працэсам акіслення і павышэння жыццёвасці тканяў арганізма, добра ўздзейнічае на зубы.

Эмаль, пакрываючы каронку зуба,—вельмі трывалае вешчаство, яна цвярдзей за сталь. Але кіслата, якая ўтвараецца ад бражэння рэштак ежы, дзейнічаючы на эмаль з дня на дзень, растварае яе хімічным шляхам.

Прайшоўшы ахоўны эмалевы слой, працэс растварэння вельмі шпарка ідзе ўглыбь, бо зубная косць па сваёй пабудове непараўнальна слабей за эмаль. У выніку разбурэння астаецца адна арганічная храшчавая аснова, пазбаўленая вапнавых солей, якая з'яўляецца спрыяючым асяроддзем для ўнядрэння і размнажэння ўсялякага роду мікробаў. З гэтага моманту неабходна ўжо спецыяльнае лячэнне ў зубнога ўрача.

Асабліва трэба памятаць аб здароўі зубоў у часе цяжарнасці. Трэба часцей паласкаць рот, бо слюна мае кіслую рэакцыю, якая шкодна дзейнічае на зубы. Акрамя таго ў цяжарных жанчын адбываецца некаторае аб'яднанне вапнавых вяшчэстваў, якія ідуць на ўтварэнне коснай сістэмы дзіцяці, з прычыны чаго зубныя ткані хутчэй разбураюцца. Таму ў часе цяжарнасці час ад часу неабходна паказвацца зубному ўрачу.

Нельга таксама забываць аб шкодным уплыве на зубы некаторых лякарстваў. Неабходна асабліва сачыць за зубамі ў часе ртутнага лячэння. Тыя, што адбываюць курс вінаграднага лячэння, таксама павінны сачыць за зубамі.

Усе тыя, у каго часта бываюць ваніты, або рвота, боль у жываце, запоры, паносы, атрыжка, зжога, слабасць, усе хварэючыя катарам страўніка, побач з агульным лячэннем павінны звяртаць ўвагу на зубы. Катар страўніка часта здараецца з-за хворых зубоў, таксама як і ад катара страўніка псуюцца зубы. У сувязі з гэтай залежнасцю побач з агульным лячэннем неабходна лячыць і зубы, ад гэтага агульнае лячэнне будзе больш паспяховае.

Каб своечасова папярэдзіць псаванне зубоў, неабходна, як правіла, раз у год паказваць зубы ўрачу.

А. ПАСПЕЛАВА.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Мінск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058; 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 910. Тыраж 12.425 экз. Уп. Галоўліта БССР № 526.

Здана ў друк. 15/VIII—39 г. Падпісана да друку 5/IX—39 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знак.

БССР імені Леніна

1953 г. 69663

ЦАНА 20 КАП.

9,127



1



2



3



4



5



6



7

Малюнак № 1.—Вышыўка гладдзю, або сцебельчатым швом. № 2.—Аплікацыя з батыста па цюлю. Абшываецца вузкім пяцельным швом, або частым швом праз край. № 3—4 вышыўка для дзіцячых плаццяў сцебельчатым швом. № 5.—Вышыўка па канве блакітным, ружовым, чорным і цёмна-жоўтым або светла-карычневым мулінэ. 6—Кружава для ўціральніка. № 7— Тамбурнае кружава. Першы кружок вяжацца асобна, да яго за пецелькі прымацоўваюцца (прывязваюцца) наступныя кружкі. Пры першай цэпачцы вяжуцца петлі для правільнай устаноўкі кружкоў, а затым ставяцца стоўбікі праз 1—2 петлі.